## Да дня нараджэння прафесара В. А. Гуліцкай

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў разам з кафедрай беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры святкуе 75-гадовы юбілей і 50-годдзе педагагічнай дзейнасці Гуліцкай Вольгі Аляксееўны.*



Вольга Аляксееўна нарадзілася 20 мая 1938 г. у вёсцы Шарпілаўка Гомельскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і сялян. Жыццё яе было няпростым з самага пачатку: у сям'і было шасцёра дзяцей, прыходзілася шмат працаваць. Як успамінае Вольга Аляксееўна, бацькі выхоўвалі іх у строгасці, шчырасці, прывучалі да працы, павагі да старэйшых, ветлівасці. Яшчэ ў няпоўным пяцігадовым узросце яна зведала дарогу ў Азарыцкі лагер смерці. Толькі звышчалавечыя сілы мамы, яе інтуіцыя і вельмі старая ікона Божай Маці «Траеручыца», якую за плячыма праз усю вайну несла маці, а таксама блізкае наступленне нашых войск выратавалі яе, трох старэйшых сясцёр і брата ад гібелі. Маці закончыла 4 класы царкоўна-прыходскай школы і некаторы час працавала настаўніцай. Магчыма, гэта стала лёсавызначальным для ўсіх дачок сям'і: усе яны закончылі педагагічныя ВНУ, сталі настаўніцамі. Сама ж Вольга Аляксееўна пасля заканчэння з сярэбраным медалём Шарпілаўскай СШ у 1956 г. паступіла ў Гомельскі педагагічны інстытут імя В. П. Чкалава на філалагічны факультэт, які закончыла ў 1961 г. У 1969 г. паступіла ў аспірантуру пры Мінскім педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага. Пасля заканчэння аспірантуры і паспяховай абароны кандыдацкай дысертацыі з 1972 г. працавала ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце спачатку старшым выкладчыкам кафедры рускай і беларускай моў, а затым дацэнтам кафедры беларускай мовы да 1992 г. Яе агульны стаж педагагічнай працы складае 50 гадоў, з якіх 23 гады выкладала сучасную беларускую мову ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны на філалагічным факультэце, працавала намеснікам дэкана.

З практычным вопытам і педагагічным майстэрствам прыйшла Вольга Аляксееўна ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры ў 1992 г.З 1999 па 2006 г. Вольга Аляксееўна – загадчык кафедры беларускай філалогіі (спачатку беларускай мовы і літаратуры). З 2006 г. працуе на кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры на пасадзе прафесара, дзе працягвае чытаць лекцыйныя курсы «Агульнае мовазнаўства», «Дыялекталогія», «Параўнальная граматыка ўсходнеславянскіх моў», «Лінгвістычны аналіз мастацкага тэксту» на факультэце інфармацыйна-дакументных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камунікацый, «Культура мовы і стылістыка» ў аспірантаў, «Беларуская мова: прафесійная лексіка» на розных факультэтах універсітэта.



Вольга Аляксееўна Гуліцкая – вядучы спецыяліст кафедры па тэорыі і практыцы сучаснай беларускай мовы, яе лекцыі і заняткі вызначаюцца высокім навуковым узроўнем і своечасовай актуалізацыяй. Яна апаніруе кандыдацкія дысертацыі, піша водгукі на аўтарэфераты, з'яўляецца кіраўніком і выканаўцай кафедральнай навуковай тэмы.

Вольга Аляксееўна – сапраўдны прафесіянал, які ўсе свае сілы і выдатныя здольнасці педагога-выхаваўцеля аддае людзям і атрымлівае ў адказ глыбокую павагу і пашану. Яна нязменна выхоўвала і выхоўвае ў студэнтаў беражлівыя, зацікаўленыя адносіны і любоў да мовы, яе мінулага і сучаснага. Вольга Аляксееўна выхавала не адно пакаленне спецыялістаў для школ Рэспублікі Беларусь, многія яе былыя студэнты сталі кандыдатамі навук і выкладаюць сучасную беларускую літаратурную мову ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны. Сваёй настаўніцай яе называюць знакамітыя беларускія пісьменнікі Анатоль Зэкаў, Міхась Башлакоў, Эдуард Акулін і інш. У 1999 г. яна – лаўрэат Каляднай прэміі БДУКМ у намінацыі «Выкладчык года». Яе праца адзначана ордэнам «Ветэран працы», Граматамі Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры, а таксама Граматамі рэктарата Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Вольга Аляксееўна, адначасова з беражлівым выхаваннем студэнцкай моладзі і ўдасканаленнем зместу выкладання сваіх курсаў, настойліва і мэтанакіравана займаецца навуковай і навукова-метадычнай працай. Яна аўтар больш за 85 навуковых і навукова-метадычных прац, у тым ліку вучэбнага дапаможніка «Уводзіны ў мовазнаўства» для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў і суаўтар вучэбнага дапаможніка «Беларуская і руская дыялекталогія» для студэнтаў-філолагаў ВНУ. Амаль усю Гомельшчыну аб'ехала ў свой час Вольга Аляксееўна разам са студэнцкімі дыялекталагічнымі экспедыцыямі, вывучаючы мову роднай зямлі; мае арыгінальныя аўтарскія работы – дванаццаць лінгвагеаграфічных картаў для ўнікальнай акадэмічнай працы «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак», матэрыялы для шэрагу слоўнікаў Гомельшчыны і інш.

Вольга Аляксееўна – аўтар вучэбных праграм па курсах «Дыялекталогія», «Уводзіны ў мовазнаўства», «Культура мовы і стылістыка» для аспі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рантаў. Асабіста і ў суаўтарстве падрыхтаваны шматлікія праграмы, напрыклад: «Беларуская мова і літаратура» да дзяржаўных экзаменаў (2009), «Беларуская мова (спецыяльная лексіка)» (2009), «Асновы культуры мовы і стылістыкі» (2011), «Лінгвістычны аналіз мастацкага тэксту» (2013) і «Сучасная беларуская літаратурная мова» (2013); апублікаваны вучэбны дапаможнік «Культура мовы» (2006), рыхтуецца да друку вучэбны дапаможнік «Лінгвістычны аналіз мастацкага тэксту» (у суаўтарстве).

Як загадчык і супрацоўнік кафедры Гуліцкая Вольга Аляксееўна праявіла выдатныя арганізатарскія здольнасці, надзвычай сур'ёзную адказнасць за даручаную справу, неабыякавае, зацікаўленае стаўленне да калег. На працягу працоўнай дзейнасці В. А. Гуліцкая прымала актыўны ўдзел у жыцці ўніверсітэта: была старшынёй камісіі па ўступных экзаменах, членам Саветаў універсітэта і факультэта ФІДК, зараз яна член Савета факультэта завочнага навучання і Праблемнага савета па філалагічных навуках.

Вольга Аляксееўна – сціплы, добразычлівы, спагадлівы чалавек, якому ўласцівы высокая працаздольнасць, суперажыванне, пачуццё адказнасці за сям'ю і за працу. Яна не толькі выдатны навукоўца, выключны кіраўнік, але і клапатлівая, працавітая матуля дваіх дзяцей, бабуля чатырох унукаў, уважлівая і чулая жонка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ